павінны стаць асновай выхавання такой асобы ў вышэйшай школе, як і дысцыпліны, што спрыяюць фарміраванню маральных прынцыпаў, працэсу сацыялізацыі асобы.

**Карнажыцкая Т.В.,**
аспірантка кафедры
сацыялогіі і тэорыі культуры

## АБ НЕАБХОДНАСЦІ КУЛЬТУРАЛАГІЧНАГА ПОГЛЯДУ НА ПРАБЛЕМУ АДУКАЦЫІ ЯК КУЛЬТУРНАГА РАЗВІЦЦЯ ДЗЯЦЕЙ

Усё часцей вучоныя свету адзначаюць рэальную небяспеку светапогляднага і каштоўнаснага вакууму ў сістэме адукацыі. Характэрнай асаблівасцю сучаснага грамадства з'яўляецца таксама распад шматлікіх формаў традыцыйнай культуры, ва ўмовах якога месца падрастаючага пакалення як суб'екта педагагічнага ўздзеяння розных грамадскіх інстытутаў з мэтай фарміравання асобы вызначана загадзя. Глыбінныя макрасацыяльныя працэсы, што адбываюцца ў грамадстве, выклікаюць неабходнасць у змяненні асноўных педагагічных парадыгмаў, у абнаўленні нацыянальнай культурна-асветнай сістэмы. Патэнцыял, які дазваляе больш інтэнсіўна і непасрэдна ўздзейнічаць на працэсы дэмакратызацыі і гуманізацыі ў адукацыйнай сферы, закладзены ў маладой навуцы — культуралогіі. Перасоўванне акцэнтаў з засваення гатовых ведаў на ўменне мысліць гнутка і творча, а таксама магчымасць убачыць і ацаніць стан дзяцінства як суб'екта культуры адкрываюць культуралогіі шырокія шляхі ў сістэме адукацыі. Вывучэнне культуралогіі дазволіць ацаніць стан культурнага ўзроўню сучаснага дзяцінства, а таксама ўмовы фарміравання асяроддзя, якое павінна садзейнічаць уваходжанню дзіцяці ў свет культуры грамадства, сацыялізацыі асобы. Уключэнне культуралогіі ў сістэму

Рэпазіторый БДУКіМ

адукацыі спрыяе рэфармаванню гэтай сістэмы, дазваляе без катаклізму пераадолець разрыў пакаленняў.

Наспела патрэбнасць у новым асэнсаванні паняцця адукацыі і ў абноўленым уваходжанні яго ў сістэму культуры, таму што сутнасць і сэнс адукацыі вызначаюцца культурай, якая яе нараджае. Прывядзенне зместу адукацыі ў адпаведнасць з інтарэсамі гуманітарна арыентаванай культуры — патрэба часу. Па-новаму трэба глядзець на сетку адукацыйных устаноў, а таксама дзіцячай пазашкольнай дзейнасці.

Для культуралогіі жыццёвы цыкл чалавека як суб'екта культуры ўяўляецца ў трох фазах: авалоданне культурай, стварэнне культуры, перадача культурнай спадчыны новым пакаленням. Гэтую праблему раскрывае М.С. Каган у кнізе "Філасофія культуры", дзе гаворыць аб тым, што "...у педагогіцы пануюць аднабаковыя ўяўленні аб выхаванні — або як аб фарміраванні індывіда грамадствам, або як аб яго далучэнні да культуры. Між тым сапраўдная складанасць антагенезу чалавека заключаецца менавіта ў тым, што яго ўмовай з'яўляецца прыродная дадзенасць — сукупнасць прыроджаных для індывіда якасцей, што падлягае апрацоўцы і перапрацоўцы сіламі грамадства і сіламі культуры".

Жыццё кожнага чалавека не з'яўляецца ізаляваным. Кожны ў асобны момант існавання ўяўляе адзінства індывідуальнага і грамадскага жыцця. Сувязі з рознымі індывідамі грамадства ў сукупнасці складаюць сістэму ўзаемаадносін пакаленняў. Можна сцвярджаць, што любое пакаленне ў кожны момант існавання знаходзіцца на вызначаным узроўні культуры.

Дзяцінства — перыяд найбольш актыўнага асваення культуры. Перад культуралогіяй паўстае задача знайсці аптымальныя шляхі ўваходжання дзяцей у культуру, фарміравання адпаведнага сучасным патрабаванням культурна-адукацыйнага ўзроўню. Перадача падрастаючаму пакаленню культурнай спадчыны не павінна зводзіцца да

простай перадачы ведаў, а дапамагаць развіццю ўмення актыўна выкарыстоўваюць у сваёй дзейнасці, канструктыўна дзейнічаць у праблемнай сітуацыі. Для гэтага неабходна выконваць наступныя ўмовы:

— дэталёвае выяўленне зыходных культурных установак адукацыі і выхавання ва ўмовах сучаснага грамадства, іх узаемаадносін, а таксама працэсаў, якія адбываюцца ў культурным развіцці пакалення;

— развіццё чалавека, здольнага працаваць з ведамі на розных узроўнях мыслення, адпаведных розным культурам, павінна стаць асноўным напрамкам адукацыі дзяцей.

У Беларусі ёсць цікавыя распрацоўкі па праблемах фарміравання і развіцця культурнага ўзроўню дзяцей. Цікава, што ўпершыню аб гэтым задумаліся педагогі, звязаныя з музычным дашкольным выхаваннем.

Музыка, як і іншыя віды мастацтва, з'яўляецца той прызмай, праз якую свет вакол бачыцца больш яскравым і дакладным, а вопыт, набыты ў зносінах з мастацтвам, робіцца мэтанакіраваным. Зносіны з музычным мастацтвам дапамагаюць дзецям па-іншаму ўспрымаць і ацэньваць з'явы, падзеі. Сёння фармулёўка задачы музычнага выхавання як "... развіццё эмацыянальнай чуласці і прывіццё цікавасці і любові да музыкі..." (гл. Радынова В.П. Слушаем музыку: Книга для воспитателя и музыкального руководителя детского сада. — М.: Просвещение, 1990. — С. 6) не задавальняе настаўнікаў. Пытанне трэба ставіць шырэй: забеспячэнне дасягнення дзецьмі патрэбнага ўзроўню культурна-музычнай адукацыі, адпаведнага не толькі запатрабаванням грамадства, але і інтарэсам дзяцей. Вялікая заслуга ў гэтым належыць аўтарам нацыянальнай праграмы дашкольнага выхавання "Пралеска", галоўнай мэтай якой з'яўляецца гарманічнае развіццё і выхаванне асобы шляхам далучэння дзіцяці да агульначалавечых культурных каштоўнасцей. Далучэнне да культурных асноў павінна ісці праз актыўную мастацкую дзейнасць. У гэтым яе асаблівая каштоўнасць.

Рэпазіторый БГУКІ

Беларуская праграма ўжо па-сапраўднаму ацэнена ў краінах Садружнасці Незалежных Дзяржаў і Еўропы, асабліва вызначаецца раздзел па мастацкім выхаванні "Сонейка", дзе прасочваецца новы падыход да мастацка-творчай дзейнасці дзяцей як неабходнага фактару фарміравання іх культуры. Вынікі мастацка-творчай дзейнасці дзяцей упершыню разглядаюцца як культурныя каштоўнасці. Дзеці, такім чынам, з'яўляюцца суб'ектамі культуры з асаблівым узроўнем культурных патрэбнасцей.

З'яўленне новай праграмы выклікала разнастайныя ацэнкі настаўнікаў-практыкаў, сярод якіх ёсць негатыўныя. Гэта сведчыць аб недастатковай вывучанасці становішча культурнага развіцця дзяцей на сучасным этапе.

Культуралагічны падыход да праблем адукацыі, распрацоўка метадаў вывучэння ўзроўню развіцця культуры дзяцей у адпаведнасці з запатрабаваннямі сучаснасці будзе садзейнічаць дэмакратызацыі і гуманізацыі культурна-асветнай сістэмы Беларусі.

**Антонович Ю.И.**,
аспирантка Российской
музыкальной академии
им. Гнесиных

## МУЗЫКАЛЬНЫЙ МОДЕРНИЗМ В СИСТЕМЕ КУЛЬТУРОЛОГИЧЕСКОГО ОБРАЗОВАНИЯ

Впервые о модернизме в музыке заговорили в конце XIX столетия, во время, чрезвычайно насыщенное разными музыкальными направлениями. Эта разноголосица была вызвана явлениями, возникающими на рубеже веков в моменты кризиса, порождающими многочисленные поиски и эксперименты. В условиях ощущения распада, гибели конца века, которые в специальной литературе принято именовать термином "fin de siecle", искусству отводилась спасительная роль. Читаем у М.Нордау: "При хаосе, господствующем в умах, от



Репозиторий БГУКИ